ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

9 ЛІПЕНЯ 2015 г. ЧАЦВЕР № 128 (27986) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



### Сакрэт Ларысы Грыбалёвай



### Студэнцкае шчасце — дах над галавой



### Што паказала ЦТ-2015?

СТАР. 3

*ЛІЧБА ДНЯ*

**81,9 кг**

*золата ў злітках прадаў за першае паўгоддзе Нацыянальны банк краіны, выкупіў назад — каля 47,2 кг. За шэсць месяцаў Нацбанк рэалізаваў 8 тысяч 460 залатых зліткаў. Найбольшым попытам у беларусаў карысталіся 1-, 5- і 10-грамовыя. Назад выкуплена 1 тысяча 865 залатых зліткаў. Серабра за студзень—чэрвень прададзена больш за 42,7 кг (1080 зліткаў), выкуплена назад каля 22,4 кг (144 зліткі). Плаціны беларусы купілі 295 г, а прадалі Нацбанку — 659 г. У злітках гэта 55 і 42 штукі адпаведна.*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 9.07.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 15446,00 | ▲ |
| Еўра | 17046,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 270,12 | ▲ |
| Укр. грыўня | 705,30 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# З ПОЎНЫМІ!



**У многіх нашых вёсках дагэтуль такая завядзёнка: калі статак пасвіцца ад дому блізка, даіць кароў удзень проста ў полі. Наш фотакарэспандэнт Анатоль Кляшчук сустрэў гаспадынь з вёскі Пялікі Шаркаўшчынскага раёна, калі яны вярталіся ад сваіх рагуль з поўнымі даёнкамі.**



## Першыя акорды «Славянкі»

**Урачыстае адкрыццё XXIV міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» адбудзецца сёння вечарам. На галоўнай сцэнічнай пляцоўцы — у Летнім амфітэатры — роўна ў 20.30 прагучаць першыя акорды «базару». Сярод беларускіх і расійскіх «зорак» Валерый Лявонцьеў, Ірына Алеграва, Тамара Гвердцытэлі, Леў Лешчанка, Ядвіга Паплаўская і Аляксандр Ціхановіч, Анжэліка Агурбаш, Алена Ланская. Выступяць артысты і калектывы з краін далёкага замежжа: з Вялікабрытаніі, Швецыі, Румыніі...**

СТАР. 3



Фота БЕЛТА.

■ Птушыная праблема

## ГАЛОДНАЕ ЛЕТА БУСЛОЎ

### Колькасць птушанят на гняздоўях сёлета скарацілася ў разы



**Увогуле, спецыялісты грамадскай арганізацыі «Ахова птушак бацькаўшчыны» (АПБ) называюць лета 2015-га адным з самых няўдалых для нашых буслоў. Назіранні паказалі, што сёлета больш за палову гняздуючых пар маюць у вывадку толькі па аднаму-двое птушанят.**

Сёння эксперты АПБ паведамляюць аб папярэдніх выніках акцыі па ўліку і кальцаванні белых буслоў. Яшчэ да выезду спецыялісты казалі пра тое, што год вельмі няпросты: працэнт няўдалага гнездавання пар як ніколі высокі, а ў гнёздах тых, хто ўсё-такі змог абзавесціся «малымі», мала птушанят. Тлумачыцца гэта многімі фактарамі: спачатку была сухая вясна, потым раптоўныя халады ў яе сярэдзіне, летнія засухі, перасыханне вадаёмаў. Пракарміцца самім ды яшчэ і выгадаваць птушанят складана не толькі буслам, але і ўвогуле ўсім птушкам.

Арнітолагі НАН Беларусі пры падтрымцы АПБ працуюць ужо другі тыдзень і могуць падзяліцца сваімі ўражанннямі.

СТАР. 3